УДК 94(476)
ББК 63.(4 Беи)
С916

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

Рэдкалегія:
старшыня арганізацыйнага камітэта канферэнцыі, доктар гістарычных навук, прафесар, дэкан гістарычнага факультэта БДПУ *М.М. Забаўскі*;
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ *А.П. Жытко* (навук. рэд.);
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі новага і навейшага часу БДПУ *Г.А. Космач*;
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі Беларусі БДПУ *А.М. Люты*;
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры айчыннай і сусветнай гісторыі БДПУ *В.А. Пілецкі*;
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі старажытных цывілізацый і сярэднявечча БДПУ *У.В. Тугай*;
доктар гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі старажытных цывілізацый і сярэднявечча БДПУ *М.І. Мініцкі*;
доктар гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі Беларусі БДПУ *М.К. Сакалоў*;
доктар гістарычных навук, прафесар кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ *В.М. Фамін*;
доктар гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі новага і навейшага часу БДПУ *І.Р. Чыкалава*;
начальнік Вучэбна-выдавецкага цэнтра БДПУ *В.Я. Навагродскі*

С916 **Сучасныя** падыходы да вывучэння крыніц па гісторыі Беларусі. Да 1000-годдзя летапіснай Літвы: матэрыялы Рэсп. навук.-тэарэт. канф., г. Мінск, 18 снеж. 2009 г. / Бел. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка; рэдкал. М.М. Забаўскі, А.П. Жытко (навук. рэд.), Г.А. Космач і інш. – Мінск: БДПУ, 2009. – 248 с.
ISBN 978-985-501-841-5.

У матэрыялах канферэнцыі разглядаюцца сучасныя падыходы да вывучэння крыніц па актуальных пытаннях сацыяльна-эканамічнай і палітычнай гісторыі Беларусі са старажытных часоў да сучаснасці.

Адрасуецца навукоўцам, выкладчыкам, студэнтам вышэйшых навучальных устаноў і ўсім, хто цікавіцца праблемамі айчыннай гісторыі.

**УДК 94(476)**
**ББК 63.(4 Беи)**

ISBN 978-985-501-841-5

© БДПУ, 2009

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

Гістарычны факультэт

# СУЧАСНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ВЫВУЧЭННЯ КРЫНІЦ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

## *ДА 1000-ГОДДЗЯ ЛЕТАПІСНАЙ ЛІТВЫ*

*Матэрыялы Рэспубліканскай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі*
г. Мінск, 18 снежня 2009 г.

Мінск 2009

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

часопіс "Крестьянин". Ён быў разлічаны, у першую чаргу, на заможнае праваслаўнае беларускае сялянства, выдаваўся штотыднёва ў Вільні з 1906 па 1915 гг. Заснавальнікам і выдаўцом быў С.Кавалюк. У выданні часопіса ўдзельнічалі П.Каранкевіч, Л.Саланевіч, А.Уруцэвіч. "Крестьянин" заклікаў умацоўваць асновы самадзяржаўя, працаваць "у рэчышчы рускіх пачаткаў у краі", падтрымліваў сталыпінскую аграрную рэформу. Рэдакцыя часопіса тлумачыла, што галоўная мэта таварыства "Крестьянин" і аднайменнага часопіса "… дабіцца такіх умоў, пры якіх "беларускаму селяніну" аблягчалася б магчымасць пашы рыць межы сваёй зямельнай дробнай уласнасці, а польскі элемент не меў бы маг чымасці ўтрымаць буйную зямельную ўласнасць у сваіх руках". Адным з нед хопаў урадавага ўказа ад 9 лістапада 1906 г. "Крестьянин" лічыў утрыманне ас ноўнай часткі зямлі памешчыкамі-палякамі, таму ён прапаноўваў устанавіць нор му на памешчыцкую зямлю ў 300-400 дзесяцін, а астатнюю прадаць сялянам [8].

Часопіс "Крестьянин" з настойлівай паслядоўнасцю друкаваў матэрыялы супраць газеты "Наша ніва" і беларускай літаратуры ўвогуле, змяшчаў творы мясцовых аўтараў, урыўкі з твораў М. Някрасава, Л. Талстога. Таксама як і газета "Северо-западная жизнь" атрымліваў урадавую субсідыю.

Дзейнасць "Белорусского общества", таварыства "Крестьянин" і аднайменнага часопіса была накіравана на актывізацыю работы крайне правых у нацыянальны руху. Так, на з'ездзе "народных прадстаўнікоў Паўночна-заходняга краю" ў 1908 г. у Вільні было прынята рашэнне падтрымліваць урадавы нацыянальны курс, садзейнічаць аб'яднанню "рускіх" сельскіх дзеячаў для культурнай "працы ў духу рускіх пачаткаў у краі". Па прыкладзе сталічных "патрыётаў" у Вільні ў лютым 19… г. мясцовае рускае насельніцтва ў імкненні зберагчы нацыянальныя набыткі Расіі край: веру, мову і народнасць, умацаваць духоўную і культурную сувязь з карэннай Расіяй. Старшынёй саюза быў абраны С.А. Кавалюк [4, с.158].

Самай буйной з манархічных партый быў "Саюз рускага народа", створаны ў лістападзе 1905 г. у Пецярбургу. Галоўны савет саюза выдаваў афіцыйны друкаваны орган – газету "Русское знамя". Існаваў і правінцыяльны манархічны друк: газеты – "Русский народ" (Яраслаўль), "За царя и родину" (Адэса), "Сусанин" (Красноярск), часопіс "Мирный труд" (Харкаў), "Новое время" (Санкт-Пецярбург) і інш. На тэрыторыі Беларусі ў 1906-1908 гг. існавала 47 мясцовых аддзяленняў СРН, што складала 3% ад усіх улічаных чарнасоценных арганізацый імперыі [9].

З 17(30).6.1912 да 12(05).1.1915 у Вільні аднавіла дзейнасць штодзённая грамадска-палітычная газета праваакцябрысцкага кірунку "Белорусский вестник". Орган "Беларускага таварыства" (рэдактар П.В. Каранкевіч) стаў рупарам беларускай буржуазіі і правінцыяльнага чыноўніцтва. Газета выступала супраць беларускага перыядычнага друку і кнігавыдання, сцвярджала, што беларуская мова спынілася ў сваім развіцці на фальклорна-этнаграфічным узроўні.

Падводзячы высновы, неабходна прыгадаць, што гістарычная канцэпцыя … у прыватнасці кансерватыўна-манархічнага друку як гістар… … пацвярджэнне ў важнасці падзей, працэсаў, лёсах асобных дзеячаў



знайшлі ў ім адлюстраванне. На падставе матэрыялаў, пачарпнутых з часопісаў і газет, можна меркаваць пра палітычную сітуацыю ў Беларусі ў пачатку XX ст.; вызначыць умовы, у якіх фарміравалася беларуская нацыя.

Ролю арганізатараў урадавых, манархічных сіл у Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай губернях у нашаніўскі перыяд узялі на сябе газеты "Окраины России", "Минское слово", "Северо-западная жизнь", "Виленский вестник", "Крестьянин" і інш. Асабліва іх дзейнасць актывізавалася ў час выбарчых кампаній у Дзяржаўную думу. Акрамя таго, указаныя выданні пільна сачылі за дзейнасцю "сваіх" дэпутатаў ад Беларусі ў самой Думе і часта цытавалі іх выступленні. Для таго каб прыцягнуць на свой бок беларускае праваслаўнае сялянства і зрабіць яго надзейнай апорай, рэдакцыі газет патрабавалі ад урада паляпшэння іх эканамічнага становішча часткова за кошт польскіх землеўладальнікаў, перадачы малазямельным на выгадных умовах часткі дзяржаўных земель, а таксама аслаблення палітычнага ўплыву яўрэйскай буржуазіі.

**Літаратура**


1. Окраины России. – 1912. – 22/29 дек. – С. 2.
2. Тамсама. – 2 июня. – С. 1.
3. Конан, У.М. Белая Русь / У.М. Конан // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Мінск, 1993. – Т. 1. – С. 493.
4. Забаўскі, М.М. Расійская дзяржаўная дума ў лёсах Беларусі (1906–1917 гг.) / М.М. Забаўскі. – Мінск: БДПУ, 2008. – 266 с.
5. Конан, У.М. Минское русское слово / У.М. Конан // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Мінск, 1999. – Т. 5. – С. 203.
6. Конан, У.М. Северо-западная жизнь / У.М. Конан // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Мінск, 2001. – Т. 6. С. 274.
7. Северо-западная жизнь. – 1911. – 28 окт. – С. 3
8. Крестьянин. – 1906. – № 34. – С. 17–19.
9. Михедько, В.А. Крайне правые организации в Беларуси: формирование и деятельность (1903–1914 гг.): автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / В.А. Михедько; БГУ. – Минск, 2001. – С. 19.


## ДЗЕННІК П.А. ВАЛУЕВА ЯК КРЫНІЦА ВЫВУЧЭННЯ ДЗЕЙНАСЦІ ВІЛЕНСКАГА ГЕНЕРАЛ-ГУБЕРНАТАРА М.М. МУРАЎЁВА Ў БЕЛАРУСІ (1863-1865 гг.)

**А.Ф. Рацько (г. Мінск, БДПУ, дацэнт)**

Адной з важнейшых крыніц па вывучэнні дзейнасці віленскага генерал-губернатара М.М. Мураўёва ў Беларусі падчас падаўлення паўстання 1863 г. і рэформ, якія праводзіліся ім з мэтай "супакоіць край", з'яўляецца дзеннік П.А. Валуева, міністра ўнутраных спраў [4–5].



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

яго думку, урад павінен адмовіцца ад прымірэння з "польскім элементам". У адносінах да мясцовых землеўладальнікаў М.М. Мураўёў прапаноўваў прытрымлівацца двух асноўных палажэнняў: "ніякага прымірэння з палякамі" і "паляка неабходна ўціхамірыць страхам і капейкаю" [7, с. 30].

У супрацьлегласць М.М. Мураўёву Валуеў арыентаваўся на дваранства як на апору дзяржавы і манархіі, нягледзячы на этнаканфесійную прыналежнасць. Дзеянні М.М. Мураўёва ў адносінах да мясцовых памешчыкаў разглядаліся міністрам унутраных спраў як варварскія. Нездарма ён даў Мураўёву ў сваім дзённіку такую характарыстыку: "Мураўёў пры ўсім розуме і ведах – татарын" [4, с. 234].

Адной з найважнейшых сацыяльных праблем у дзяржаве Валуеў лічыў умацаванне адносін самаўладдзя з дваранствам, што б спрыяла знікненню апазіцыйнага ўраду руху дваранства і сумеснай барацьбе з рэвалюцыйным рухам. Прааналізаваўшы сітуацыю ў краіне, Валуеў распрацаваў праграму палітычных уступкі дваранству ў форме ўвядзення пачаткаў агульнадзяржаўнага дарадчага прадстаўніцтва [8, с. 25]. Прадстаўнічыя інстытуты разглядаліся ў якасці новых пачаткаў, на аснове якіх павінна было адбывацца больш шчыльнае згуртаванне ўсіх частак Расійскай імперыі. Запрашэнне ўплывовых асоб (такіх як В.М. Старжынскі – гродзенскі генерал-губернатар, прадвадзіцель дваранства) Заходняга краю ў Пецярбург для кансультацый Валуеў лічыў важным крокам у гэтым накірунку. Валуеў распрацаваў праект рэарганізацыі Дзяржаўнага савета, па якому прадугледжвалася прыцягненне да яго заканадаўчых работ "часовых саветнікаў, узятых з розных правінцый імперыі", тым самым, на думку Валуева, "...польскае, заходняе, прыбалтыйскае і, можа, іншыя будучыя пытанні шэрагу будуць вырашацца не ў Варшаве, Вільні, Рызе, Тыфлісе ці ў Іркуцку, а ў С. Пецярбурзе і ў Маскве" [4, с. 342].

Арэнай супрацьстаяння паміж віленскім генерал-губернатарам і Валуевым стаў Заходні камітэт (замест распушчанага ў 1848 г. Камітэта заходніх губерняў). Дзейнасці Заходняга камітэта надавалася надзвычай важнае значэнне, пра што сведчыць яго склад: шэф жандараў, ваенны міністр, міністры замежных спраў, юстыцыі, унутраных спраў, фінансаў, народнай асветы, дзяржаўных маёмасцей, обер-пракурор Сінода, віленскі і кіеўскі генерал-губернатары. Узначальваў Заходні камітэт старшыня кабінета міністраў князь П.П. Гагарын [1, с. ...]. Аляксандр II даручыў менавіта Валуеву кіраваць работай Заходняга камітэта. Валуеў піша ў сваім дзённіку: "Гасудар прасіў мяне на справах Заходняга камітэта прыняць на сябе ролю Растоўцава ў сялянскай справе" [4, с. 206-207]. Аднак, як сцвярджае сам Валуеў, ён гэтай ролі не выканаў, а Заходні камітэт "...перадаў прыналежную яму ініцыятыву ў рукі генерал-губернатараў" [4, с. 344, 346]. У Заходнім камітэце ... абмяркоўваемыя праекты М.М. Мураўёва ... падтрымліваліся Аляксандрам II. Так, напрыклад, пры галасаванні па пытанні ... устанаўленні працэнтнай нормы (10%) для палякаў пры паступленні ... ... 4 члены Камітэта, у тым ліку М.М. Мураўёў, выказаліся за



устанаўленне дзесяціпрацэнтнай нормы. Астатнія 7 членаў Камітэта, у тым ліку і Валуеў, палічылі няёмкім і немэтазгодным устанаўліваць падобную норму. Аляксандр II зацвердзіў меркаванне меншасці [4, с. 415].

Аднак непрыняццё палітыкі М.М. Мураўёва большасцю членаў Заходняга камітэта, незадаволенасць мясцовых памешчыкаў аграрнай палітыкай у краі і іх бесперапынныя скаргі ў Пецярбург не маглі не ўплываць на адносіны цара да віленскага генерал-губернатара. У сваім дзённіку Валуеў піша пра размову з Аляксандрам II, якая адбылася 15 студзеня 1865 г.: "Каго ж ты думаеш назначыць на яго месца [маскоўскага генерал-губернатара], – сказаў гасудар. – Цімашава? – Не, - адказваў я, - мне падавалася магчымым прапанаваць Вам Мураўёва. Такім чынам... - Цар усміхнуўся і даволі весела, уваходзячы ў маю думку аб магчымасці быць такім чынам Мураўёва з Вільні, сказаў: - L'idée n'est pas mauvaise ("Думка неблагая" фр.)" [5, с. 17].

Такім чынам, дзённік Валуева ўтрымлівае шмат каштоўных фактаў аб дзейнасці віленскага генерал-губернатара М.М. Мураўёва ў Беларусі (1863–1865 гг.). Ён дае шэраг вострых і трапных характарыстык як самаму М.М. Мураўёву, так і яго акружэнню, раскрывае патаемныя спружыны гэтай дзейнасці, апавядае аб розных сакрэтных нарадах у вышэйшых сферах, якія не траплялі ў афіцыйных дакументах. "Я не пішу гісторыі. Я не выкладаю падзей ... іх сукупнасці і паслядоўнасці і не прадпрымаю канчатковай адзнакі ... і памылак маіх сучаснікаў. Я выпрацоўваю матэрыял для будучых гісторыкаў і тых, можа быць, чытачоў, якія пажадаюць шляхам параўнання гэтага ... з іншымі гістарычнымі матэрыяламі скласці сабе самастойнае ... аб падзеях і людзях таго часу" [4, с. 352].

**Крыніцы і літаратура**


Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелЭн, 1996–2004. – Т. 7: Застаўка – Кантата. 1998. – 608 с.

Большая Российская энциклопедия: в 30 т. – М.: Большая Российская энциклопедия, 2006. Т. 4. Большой Кавказ – Великий канал. – 751 с.

Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. – Т. 2. (1772-1903 гг.). / ... Нікольскі і інш. – Мінск: Выдавецтва АН БССР, 1940. – 938 с.

Дневник П.А. Валуева, министра внутренних дел. В 2 т. / под ред. П.А. Зайончковского. – М.: Из-во АН СССР, 1961. – Т.1. 1861–1864. – 420 с.

Дневник П.А.Валуева, министра внутренних дел. В 2 т. / под ред. П.А. Зайончковского. – М.: Из-во АН СССР, 1961. – Т.2. 1865–1876. – 587 с.

Комзолова, А.А. Политика самодержавия в Северо-Западном крае в эпоху Великих реформ / А.А. Комзолова. – М.: Наука, 2005. – 383 с.

Самбук, С.М. Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX века / С.М. Самбук. – Минск: Наука и техника, 1980. – 222 с.

Шепелев, Л.Г. Внутренняя политика царизма с середины 50-х до начала 80-х гг. XIX в. / Под ред. Р.Ш. Ганелина. – Л.: Наука, 1978. – 247 с.




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ